Источник: "Беларусь" - № 4, 2012-04-17




# Новыя рысы палеткаў

**ЦЯПЕРАШНЮЮ ПАСЯЎНУЮ КАМПАНІЮ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ПРАВОДЗЯЦЬ НЕ ТОЛЬКІ З УЛІКАМ НАПРУЖАНЫХ ЗАДАЧ ПА АБ'ЁМАХ ПРАДУКЦЫІ. ПРЫКМЕТНЫЯ ЗМЕНЫ ЗВЕДАЛА СТРУКТУРА ПАСЯЎНЫХ ПЛОШЧАЎ**

Пачынаючы з гэтага года гаспадаркі ўпершыню дасканала займуцца вырошчваннем сланечніку і соі. Упершыню гэтым культурам надаецца вялікая ўвага. Галоўная мэта — забяспечыць жывёлагадоўлю бялковай сыравінай уласнай вытворчасці, скараціўшы выдаткі на вытворчасць малака і мяса. І да 2015 года выканаць задачу, пастаўленую Урадам, — нарасціць экспарт беларускіх прадуктаў харчавання з цяперашніх 4 мільярдаў долараў да 7,2 мільярда.

Паводле слоў намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Васіля Паўлоўскага, сёлета да 25 тысяч гектараў з ранейшых паўтары тысяч павялічваюцца пасевы сланечніку. Плошча пад сояй павялічыцца больш як у пяць разоў. Заняцца вырошчваннем цеплалюбівых культур сельгаспрадпрыемствы прымусіў зусім не клімат, які змяніўся: за апошнія дзесяць гадоў тэмпература паветра, паводле ацэнак метэаролагаў, у Беларусі павялічылася ў сярэднім на 1,2 градуса. Але прычына перагляду палёў усё ж іншая. Сёння надзённай задачай беларускага АПК з'яўляецца рост прадукцыйнасці жывёлагадоўлі, якая мае салідны экспартны патэнцыял. Да 2015 года гаспадаркі павінны вырабіць 8—10 мільёнаў тон малака і 2 мільёны тон мяса. Забяспечыць істотны рост вытворчасці немагчыма без паўнацэннага кармлення жывёлы. А гэтаму перашкаджае дэфіцыт бялковай сыравіны, які пастаянна зведваюць сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Толькі летась у краіну было завезена 780 тысяч тон шроту са сланечніку і соі на 280 мільёнаў долараў. "Лепш гэтыя сродкі замест замежных закупак заплаціць сваім сялянам, патраціць на ўкараненне тэхналогіі вырошчвання гэтых культур у сябе", — лічыць Васіль Паўлоўскі.

Займацца сланечнікам і сояй будуць у асноўным гаспадаркі поўдня краіны — Гомельскай і Брэсцкай абласцей. Але дакладнае прытрымліванне тэхналогіі не выключае атрыманне ўраджаю і ў іншых рэгіёнах. Да прыкладу, летась соя выдатна ўрадзілася ў Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці. Плануецца, што ў бліжэйшыя гады гаспадаркі забяспечаць патрэбнасці жывёлагадоўлі ўласнай бялковай сыравінай не менш чым на 50 працэнтаў.

Знамянальна, што сланечнік і соя — не адзіныя навацыі цяперашняга палявога сезона. Вырошчванне алейнага лёну — яшчэ адзін перспектыўны напрамак для сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Да апошняга часу льняны алей, які адрозніваецца сваімі карыснымі ўласцівасцямі, не быў шырока прадстаўлены на беларускім харчовым рынку. Ён пастаўляўся з-за межаў краіны ў асноўным праз аптэчныя сеткі. Цяпер гэтую нішу зойме прадукт уласнай вытворчасці. Першыя 70 гектараў алейнага лёну гаспадаркі засеюць гэтай вясной. У асноўным гэта будуць насенныя ўчасткі. А ў будучым годзе алейны лён зойме плошчу ў 15 тысяч гектараў. Першы цэх па перапрацоўцы масланасення ўжо абсталяваны на заводзе ААТ "Лідскі лён". Аналагічныя тэхналогіі ўкараняюцца таксама на льнозаводах у Паставах і ў Валожыне. У Мінсельгасхарчы лічаць: карысны прадукт будзе карыстацца попытам не толькі на ўнутраным рынку, але і на знешнім.

Пры гэтым, зразумела, сельскагаспадарчыя прадпрыемствы будуць працягваць апрацоўку лёну-даўгунцу. Характэрна, што гэтай культурай сяляне цяпер займаюцца ў супрацоўніцтве з вучонымі Навукова-практычнага цэнтра па земляробстве Нацыянальнай акадэміі навук. Мэта — павысіць ураджайнасць і якасць ільновалакна.

Источник: "Беларусь" - № 4, 2012-04-17

Гэтай вясной упершыню вызначаны дакладны пералік гатункаў лёну-даўгунцу, рэкамендаваных да вырошчвання. Замест ранейшых 34 гатункаў гаспадаркі будуць засяваць палі 10.

Словам, у наяўнасці новая тэндэнцыя ў развіцці беларускага АПК. Галіна, перад якой яшчэ дзесяць гадоў назад стаяла толькі задача забеспячэння харчовай бяспекі краіны, сёння ўсё больш упэўнена адчувае сябе на знешнім харчовым рынку, асвойваючы новыя нішы і зарабляючы валюту. Трэць аб'ёмаў сельгаспрадукцыі цяпер пастаўляецца на экспарт. Прадукты, якія раней Беларусь завозіла з-за межаў — да прыкладу, харчовую пшаніцу, грэчку і нават гародніну, — цяпер вырабляе сама. А смелыя гаспадарнікі бяруцца за вырошчванне нават тых культур, якія, раней лічылася, у кліматычных умовах Беларусі не могуць даць ураджаю. Напрыклад, у Рэчыцкім і Кобрынскім раёнах ёсць фермерскія гаспадаркі, якія вырошчваюць кавуны. А ў Навукова-практычным цэнтры па бульбаводстве і плодагароднiцтве Нацыянальнай акадэміі навук створаныя ўстойлівыя для беларускіх умоў гатункі вінаграду. І яго плантацыі ўжо высаджаныя не толькі ў паўднёвых, але і ў цэнтральных раёнах — напрыклад, у Самахвалавічах пад Мінскам.

## ВЯСНОВЫ ДЗЕНЬ ГОД КОРМІЦЬ

Вядома, поспехі беларускіх аграрыяў шмат у чым абумоўленыя салідннай фінансавай падтрымкай АПК, якую аказвае дзяржава. Толькі за апошнія дзесяць гадоў у галіну было ўкладзена амаль 40 мільярдаў долараў.

Вялікіх фінансавых уліванняў запатрабуе і цяперашняя пасяўная кампанія. У параўнанні з 2011 годам расходы вырастуць больш як у два разы.

Значную частку затрат возьмуць на сябе сельгаспрадпрыемствы. На 20 працэнтаў пасяўную прафінансуе рэспубліканскі бюджэт. Частку затрат пакрыюць мясцовыя бюджэты. Намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар эканамічных навук, акадэмік Уладзімір Гусакоў лічыць: дзяржаўная падтрымка сельскагаспадарчых прадпрыемстваў — гэта своеасаблівая кампенсацыя за тое, што дзяржава не дае аграрыям права продажу сваёй прадукцыі па свабодных цэнах. Іншая справа, што гаспадаркі павінны быць зацікаўленыя ў мінімізацыі вытворчых затрат, імкнуцца да самаакупнасці і самафінансавання. Бо ўмовы дзяржпадтрымкі становяцца больш жорсткімі, і трацiць грошы ўпустую не атрымаецца. Тым больш што з 1 студзеня краіна жыве па Пагадненні аб адзіных правілах дзяржаўнай падтрымкі сельскай гаспадаркі ў Мытным саюзе, які прадугледжвае скарачэнне яе з 16 працэнтаў да 10 ужо да 2016 года.

Дарэчы, у новым сезоне ў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў будуць добрыя магчымасці для заробку. Каля дзевяці мільёнаў тон збожжа, восем мільёнаў тон бульбы, звыш чатырох мільёнаў тон цукровых буракоў і каля двух мільёнаў тон гародніны — такі ўраджай павінны ўвосень сабраць з палёў беларускія аграрыі. Закупачныя цэны на новы ўраджай павялічваюцца прыкладна на 30 працэнтаў. Гэта добры стымул для работы. І хоць лічыцца, што прагнозы на ўраджай — справа няўдзячная, аграрыі сёння не хаваюць аптымізму. Ёсць усе падставы спадзявацца на поўныя засекі. У адрозненне ад вясны 2011 года, калі з-за гібелі азімых давялося перасяваць амаль 400 тысяч гектараў, цяпер узровень страт ад зімоўкі складае не вышэй за 10 працэнтаў. Таму з задачай па атрыманні 8,8 мільёна тон збожжа сяляне справяцца. Праўда, на думку Уладзіміра Гусакова, гэтым патэнцыял беларускага раслінаводства далёка не вычарпаны. Ёсць магчымасці ўжо ў бліжэйшыя гады выйсці на 10—12 мільёнаў тон збожжа, а ў перспектыве і на 15 мільёнаў тон.

Так, харчаванне — той каштоўны рэсурс, у які мае сэнс укладваць сродкі і сілы. Цэны на яго ў бліжэйшы час на сусветным рынку зніжацца не будуць. Таму ёсць некалькі прычын. Прырост насельніцтва на планеце перавышае прырост харчавання. Пастаянна даражэюць нафта і газ. Плюс скарачаецца колькасць урадлівых земляў. Харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя ААН — ФАО — прыйшла да высновы, што за апошнія трыццаць гадоў у разліку на душу насельніцтва аб'ёмы вытворчасці сельгаспрадукцыі зусім не павялічыліся. Так што ў выйгрышы аказваюцца краіны, якія не толькі поўнасцю забяспечваюць сябе прадуктамі харчавання, але і могуць імі гандляваць на знешнім рынку. Таму беларускія навукоўцы ў супрацоўніцтве з аграрыямі прадаўжаюць працаваць над удасканаленнем пасяўных плошчаў. І не выключана, што праз пяць гадоў палі краіны будуць адрознівацца яшчэ большай разнастайнасцю і багаццем.

Лілія **Агароднікава**

